# Проект «ВОСПИТАНИЕ ТРУЖЕНИКА СЕЛА»

***Л.Ю. Петрусевич,***
***руководитель школьного музея «Спадчына»***

Организация воспитательной работы в сельской школе имеет гораздо большее значение, чем в городской, так как ее ученики ограничены в возможности выбирать объединение по интересам, посещать различные кружки и секции. Замкнутость социального пространства, удаленность от культурных центров, ограниченность сферы социальных связей учащихся создают трудности в организации образовательной работы в сельской школе. Именно школа часто становится основным очагом культуры на селе, оказывает значительное влияние на формирование духовного облика его жителей. Это позволяет привлекать учащихся к активному участию в решении экономических и культурных проблем, с ранних лет приобщать их к делам села и тем самым формировать у детей чувство принадлежности к своей малой родине и ответственности за нее. Социальный заказ школе на преобразование в сфере воспитания мы видим в том, чтобы педагогическими средствами попытаться ослабить усилившуюся тенденцию оттока молодежи из села.

В настоящее время в селе практически отсутствуют традиционные ремесла и так называемые народные промыслы. Изменилась и роль крестьянина, который выполняет роль не хозяина, а наемного работника, что, безусловно, отрицательно влияет на его самооценку. Мало отличается от городского и некогда самобытный язык современного сельского жителя, во многих селах практически исчезли традиционные праздники и ритуалы. В связи с ухудшением экологической обстановки для сельских школьников особо важно овладеть основами экологической культуры и природосберегающего хозяйствования. Изучение исторического прошлого села и возрождение традиций являются мощным воспитательным потенциалом, основанным на близких к ребенку понятиях: любви к родителям, родным местам, родному укладу жизни.

Таким образом, школа, с одной стороны, очень сильно ощущает на себе все изменения, трудности, возникающие в жизни села, местном хозяйстве, а с другой – сама способна оказывать существенное влияние на решение социальных проблем села, оперативно реагировать на происходящие вокруг события. Развитие школы неразрывно связано с ее социальным окружением, использованием воспитательного потенциала сельского социума. (КСУП «Ваверка – Агро», Ваверское лесничество, Ваверский ДК, Ваверская участковая больница). Школа при этом может успешно выполнять роль носителя, генератора и трансформатора лучших, прогрессивных идей, традиций, обрядов. В нашей школе имеются особенно благоприятные условия для сотрудничества, организации совместной деятельности и общения, творчества педагогов и детей, старших и младших, так как нет резкой обособленности между классами, учащимися разного возраста.

Выпускники сельской школы должны уметь жить в условиях обостренной социальной и материальной неопределенности, решать задачи организации новых форм хозяйствования на селе, сельская школа призвана обеспечить соответствующую подготовку учащихся с учетом данных изменений. Воспитание выпускника, способного к добровольному выбору сельского образа жизни, сельскохозяйственного труда, готового к умелому сочетанию трудовой деятельности с заботливым, бережным отношением к земле, технике, окружающей природе дало толчок к разработке проекта «Воспитание труженика села».

**Цель** проекта: создать условия для воспитания ценностного, созидательного отношения школьников к сельскому образу жизни на основе удовлетворения их индивидуальных, образовательных, профессиональных и социальных потребностей.

**Ожидаемый результат**: закрепление выпускников на селе и участие их в возрождении, сохранении и развитии традиций, производства на селе.

**Для детей**: личностное и профессиональное самоопределение, развитие творческих и интеллектуальных способностей.

**Для школы**: повышение рейтинга среди учащихся, родителей, социума, поднятие престижа ГУО, развитие отношений с социальными партнерами.

**Для села:** сохранение и развитие производства на селе, возрождение традиций.

**Для родителей**: выполнение социального заказа семьи по подготовке их детей к взрослой жизни в условиях села.

**Воспитательные задачи:**

- Воспитание чувства гордости за свою школу (изучение истории школы, создание летописи школы, возрождение традиций, оформление и украшение школьной территории).
- Воспитание любви к родному краю, чувства гордости за его историю, культуру, традиции через реализацию творческих проектов социальной направленности (летопись села, участие в благоустройстве села, подготовка сельских праздников и экологических акций).
- Обучение учащихся умелому сочетанию деятельности с заботливым, бережным отношением к земле, технике, окружающей природе (проектная деятельность, профессиональное обучение).
- Воспитание уважения к сельскому труду (опытническая работа).
- Воспитание бережного отношения к природе (посадка деревьев, участие в субботниках по благоустройству территории села с привлечением родителей).
- Поддержание культурного наследия (работа с соломкой, резьба по дереву, льняные изделия, вышивка).
- Развитие навыков, обеспечивающих включение выпускников в общественную жизнь.
- Формирование духовно-нравственных ценностей (факультатив по православной культуре, знакомство с церковными праздниками).

**Организационные задачи:**

- Создание условий для дифференцированного обучения сельских школьников, имеющих различные образовательные потребности.
- Применение технологий и методик, повышающих эффективность обучения и воспитания в сельской школе.
- Обеспечение участия учащихся в производительном труде созидательной, общественной направленности, основанном на личной и общественной мотивации.
- Повышение статуса и роли семьи в воспитательной деятельности школы.
- Установление связи с социумом по вовлечению в совместную деятельность, по формированию у обучающихся ценностного отношения к сельскому образу жизни.
- Организация целенаправленной профориентационной работы.
- Использование производственного потенциала социальных партнеров для формирования у учащихся необходимых умений и навыков в условиях села.
- Активное привлечение родителей для формирования у обучающихся духовно-нравственных качеств, умений и навыков, нужных для сельского труженика.

Проект предполагает:

Создание сельской школы как центра живой культуры, призванной обеспечивать социальную и духовную зрелость подрастающего поколения. В школе предполагается создание ценностей духовной и материальной культуры, культуры сельского труда, семейных отношений, образцов экологической культуры.

Создание различных проектов учащихся, направленных на развитие, благоустройство, экологическую защиту, туристско-краеведческую деятельность, формирование жизненно необходимых практических умений и навыков по работе с деревом, металлом, тканью, другими материалами, уходу за животными, землей, благоустройству своего дома, приусадебного хозяйства.

Создание понятного для всех участников образовательного процесса, социальных партнеров, общественности инструментария для оценки и самооценки уровня сформированности качеств гражданина и сельского труженика.

Создание целостной системы мотивации родителей, повышение их активности по формированию личностных качеств их детей в рамках не только школы, но и семьи.

Отсутствие противоправных действий учащихся.

Увеличение доли выпускников, решивших связать свою будущую профессиональную деятельность с селом.

## «З вытокаў ваверскай зямлі»
## Музейны ўрок – экскурс у мінулае

**Мэта:** стварэнне ўмоў для развіцця цікавасці дзяцей да культурнай спадчыны народа, далучэнне дзяцей да традыцый народнай культуры.

**Задачы:**

1. Пазнаёміць дзяцей з бытам і культурнымі традыцыямі нашых продкаў; фарміраваць пачуццё прыналежнасці да гістарычнага мінулага свайго народа.
2. Развіваць лагічнае мысленне дзяцей, вобразнае ўспрыманне народнай спадчыны.
3. Выхоўваць у дзяцей павагу да культурнай спадчыны нашых продкаў, да працы працаўнікоў вёскі.

**Матэрыялы і абсталяванне:** кніжная выстава «Мая малая радзіма»; выстава школьных газет «Вавёрочка»; экспазіцыі школьнага гісторыка-краязнаўчага музея «Ваверскі кірмаш», «Беларуская хатка».

**Ход урока**

Педагог. Наша падарожжа пачынаецца... У даўнія-даўнія часы велізарны свет акружаў нашых продкаў. Чалавек адчуваў сябе залежным ад сіл прыроды, бо ў прыродзе былі і добрыя, і злыя духі. Імкнучыся абараніцца ад усяго небяспечнага, чалавек стварыў сабе прытулак – дом.

Што такое дом у вашым разуменні? *(Адказы дзяцей)*

Дом – гэта жыллё. Дом – гэта месца, дзе мы жывем ўсёй сям'ёй. Дом – гэта мая сям’я. Дом – гэта будынак для жылля.

Нашым продкам многае трэба было ведаць, каб пабудаваць сабе жыллё. Перш за ўсё выбіралася месца добрае. Каб вада была побач, ды каб не ў нізіне, а то вясной затопіць, ды каб у доме адчуваць сябе добра. Доўга прыглядаліся продкі нашы да месца будучай хаты: калі птушка часта садзіцца на зямлю, то і месца тут добрае. Або калі святло скрозь аблокі праб'ецца, значыць, месца багамі было адзначана, можна хату ставіць. І першае, што трэба было зрабіць – гэта абараніць месца будучай хаты ад ліхіх сіл, таму яго абмахвала вакол па крузе, гэта знак неба і сонца, гэта абярэг.

*Гучыць песня «Спадчына»*

Педагог. Дзеці! Рада вітаць вас у сценах нашага школьнага музея.

Аб вёсцы нашай любімай
Будзе размова,
Аб вёсцы роднай і мілай,
Дзе мы ўсе жывём!

Кожны чалавек павінен ведаць пра тое месца, дзе ён нарадзіўся, жыве. У вялікай краіне ў кожнага чалавека ёсць маленькі куток – вёска, вуліца, дом, дзе ён нарадзіўся. Гэта яго маленькая радзіма. А з мноства такіх маленькіх родных куткоў і складаецца наша агульная вялікая Радзіма... Радзіма пачынаецца на парозе тваёй хаты. Яна велізарная і выдатная. Радзіма заўсёды

з табой, дзе б ты ні жыў. І ў кожнага яна адна. Як мама. Мы любім Радзіму. А любіць Радзіму – значыць жыць з ёю адным жыццём.

У нашым гісторыка-краязнаўчым музеі сабрана шмат матэрыялаў пра гісторыю і засяленні Ваверкі, пра людзей сяла і гісторыю адукацыі нашага краю. Маімі памочнікамі будуць экскурсаводы музея.

(*Знаёмства з экспазіцыямі музея)*

Экскурсавод 1. Экспазіцыя «Ваверский кірмаш». Вёска Ваверка знаходзіцца ў Лідскім раёне Гродзенскай вобласці. Былое Вялікае Княства Літоўскае, а сёння – Рэспубліка Беларусь. У першым Наўгародскім летапісе, у спісе рускіх гарадоў згадваецца горад Ваверэск. Вучоныя мяркуюць, што горад, магчыма, знаходзіўся на тым жа месцы, дзе сёння вёска Ваверка. Калісьці тут было знойдзена бронзавае ўпрыгожванне з элементамі эмалі, ў 1904 годзе гэта ўпрыгожванне было перададзена ў Віленскі музей.

Ваверка ў летапісі ўпершыню ўпамінаецца менавіта ў сувязі з будаўніцтвам касцёла ў 1413 годзе. У 1570 годзе Ваверка набыла статус мястэчка, а ў 1613 годзе трапляе на геаграфічную карту, якую склаў Макоўскі. Гэта быў Залаты час Ваверкі.

Ваверка славілася сваім кірмашом. Экспазіцыя «Ваверскі кірмаш» вяртае нас у той час, калі прылады працы былі драўляныя, самаробныя. Людзі прадавалі прылады працы або мяняліся імі на кірмашы. Гэта косы, сярпы, жалезныя прасы, матавілы, хатнія і вулічныя ліхтары і многае іншае.

Экскурсавод 2. Экспазіцыя «Беларуская хатка». Давайце на хвілінку перанясёмся ў беларускую хатку:

Усе мы з хат,
Усе мы з цішыні,
З бабуліных, дзядуліных далоняў.

У фондзе нашай хаткі знаходзіцца звыш 50 экспанатаў музейнага прызначэння. Асноўная маса экспанатаў – гэта натуральныя рэчы, якімі карысталіся сяляне. Яны сабраныя з розных мясцін Беларусі. У кутку можна ўбачыць саматканыя абрусы, вышытыя ручнікі з бабулінага куфэрку, гліняны посуд, драўляныя рэчы, лапці, якія раней служылі людзям.

Экскурсавод 3. Калаўрот быў верным спадарожнікам сялянкі на працягу ўсяго яе жыцця. Мабыць, ні адна прылада сялянскай працы не упрыгожвалася так разнастайна, любоўна, як калаўрот. Часта калаўрот быў каштоўным падарункам. Жаніх дарыў калаўрот нявесце, бацька – дачцэ, муж – жонцы. Прыгожы калаўрот перадаваўся ў спадчыну ад маці да дачкі, ад бабулі да ўнучкі. У некаторых месцах па звычаю жаніх павінен быў зрабіць калаўрот ўласнаручна, а стары бацькоўскі зламаць ў знак заручын. Прадзенне і ткацтва былі самымі працаёмкімі з усіх відаў работ, якія падалі на плечы сялянкі . Амаль пяць месяцаў у год, з лістапада па сакавік, праводзіла яна за калаўротам.

Экскурсавод 1. Праца жанчын часта працягвалася за поўнач, і даводзілася карыстацца лучынай, уставіўшы яе ў свяцец, побач з якім (у супрацьпажарных мэтах) стаяла бочка з вадой. Запаляць асінавую лучыну... Утульна, светла. Можна і воўну прасці. І дзеткам ёсць справа: мяняць

лучыны, дагарэлую ў кадку з вадой кідаць. Колькі трэба было спрыту і цярпення, каб нітка атрымалася тонкай, роўнай і трывалай: ледзь пацягнеш мацней – яна абарвецца, а крыху слабей – будзе занадта тоўстай або няроўнай. З калаўротамі дзяўчаты хадзілі на вячоркі. Прыгожы калаўрот быў гонарам уладальніцы. Яна несла яго на вечарыну, трымаючы за ножку так, каб усе бачылі разьбяны ці размаляваны нарад калаўрота. На вячорках дзяўчаты садзіліся на лавы, пачыналі прасці, зацягвалі песні, прыпеўкі.

Экскурсавод 2.

Прала лён, прала лён
Ды льняное валакно.
Прыходзь да мяне, мілёначак,
З тальянкой пад акно.

Неўзабаве ў хату прыходзілі хлопцы. Праца чаргавалася са спевам, гульнямі і танцамі. Свята не гультайства, а майстэрскага рукадзелля! А як шылі-вышывалі, так і песні напявалі. Песні спявалі ад душы, песні былі добрыя! Весела спяваецца – весела прадзецца! На такія вячоркі хлопцы таксама працу з сабой прыносілі. Хто лапці плёў, хто збруяй конскай займаўся.

А што яшчэ рабілі на вячорках? Не толькі весяліліся, але і адзін да аднаго прыглядаліся: дзяўчаты наканаванага сабе шукалі; хлопцы глядзелі не толькі на дзявочую красу, але і на працу звярталі ўвагу: ці хуткая і ўмелая ў жаночых справах. Па спрадзенай нітачцы і характар вызначалі. Калі нітка ўся ў вузлах, рвецца часта, то і нораў у дзяўчыны непакладзісты (незгаворлівы, няўступлівы). Калі нітка тонкая ды роўная, значыць, дзяўчына спакойная, працалюбівая.

Педагог. Даўней заўсёды паважліва ставіліся да майстроў і рукадзельніц. За працу пачыталі, за лень ганілі. Майстэрства беражліва перадавалі з пакалення ў пакаленне, дзякуючы гэтаму да нас дайшлі вырабы народных умельцаў мінулых стагоддзяў.

*Гульня «На незаселеным востраве» (вучні падзелены на групы).*

Уявіце сябе на незаселеным востраве. Тут ёсць усе ўмовы для жыцця: прэсная вада, рыба ў рэках, птушкі і звяры ў лясах, фруктовыя дрэвы... А ў вас, зусім выпадкова, апынулася насенне сланечніка і гароху, пшаніцы і морквы, а таксама сякера, піла, малаток, скрутак вяроўкі... Карацей, нешта сярэдняе паміж востравам Рабінзона Круза з кнігі Даніэля Дэфо і таямнічым востравам капітана Нэма з кнігі Жуля Верна.

Ваша задача: скласці спіс з 10 відаў прафесійнай дзейнасці, якія з’яўляюцца самымі неабходнымі, на ваш погляд, для таго, каб выжыць на незаселенай выспе.

*Абмеркаванне адказаў груп, ранжыраванне відаў прафесійнай дзейнасці.*

*Гульня «Скончы сказ» (вучні працуюць індывідуальна)*

Зараз кожны атрымае картку з пяццю сказамі, якія неабходна скончыць. А потым мы паглядзім, што ў вас атрымалася.

1. Людзі працуюць дзеля ...

2. Праца – гэта ...

3. Пры выбары прафесіі людзі часта не ўлічваюць ...

4. У любой прафесійнай працы самае важнае ...

5. Шчасце – гэта ...

*(Адказы вучняў)*

Педагог. Мы вас пачулі, а цяпер давайце параўнаем вашы выказванні з думкамі філосафаў, эканамістаў, палітыкаў.

1. Людзі працуюць дзеля задавальнення сваіх патрэбаў, дзеля самавыяўлення ўласнага «Я».

2. Праца – гэта самааддача і творчасць.

3. Пры выбары прафесіі людзі часта не ўлічваюць паняцці, якія выражаюцца трыма словамі: хачу, магу, трэба.

А. Хачу – сваё жаданне.

Б. Магу – свае магчымасці, здольнасці, веды, стан здароўя.

В. Трэба – патрэбы рынку працы.

4. У любой прафесійнай працы самае важнае – веды і ўменне іх прымяняць на практыцы.

5. Аднойчы на пытанне «Што ж такое шчасце?» прагучаў такі адказ: «Шчасце – гэта калі раніцай з радасцю ідзеш на працу, а ўвечары з радасцю вяртаешся дадому».

Значыць, шчасце немагчыма без правільнага выбару сваёй прафесіі. Гэтая праблема рана ці позна ўстае перад любым чалавекам. Вы таксама праз некалькі год паўстанеце перад такім выбарам. І каб ваш выбар у будучым прынес вам шчасце, мы будзем знаеміцца з прафесіямі розных кірункаў. Пра некаторыя з іх вы можаце прачытаць у нашай школьнай газеце «Вавёрочка».

Сёння мы з вамі здзейснілі экскурс у мінулае, яшчэ раз акунуліся ў свет нашых продкаў, і, я спадзяюся, вы зразумелі, што нашы продкі працавалі не пакладаючы рук, каб жыць шчасліва.

Рэфлексія

Што вам запомнілася з падарожжа?

Што вы ўзялі для сябе?

Ці захочацца вам яшчэ вярнуцца ў наш музей, каб акунуцца ў мінулае?